

Мал. 85. Касцёл Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі ў аг. Будслаў

**Падвядзём вынікі.** Беларусы складаюць асноўную частку насельніцтва ў этнічнай структуры. Асноўныя канфесіі — праваслаўнае і рымска-каталіцкае хрысціянства.

***Праверце сябе.*** 1. На якія віды падзяляецца міграцыя? 2. Якія этнасы пераважаюць у структуры нацыянальнага складу насельніцтва Беларусі? 3. Назавіце канфесіі, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Беларусі.

***Праблемныя пытанні.*** 1. Якія змены адбыліся ў напрамках міграцыйных патокаў на пачатку XXI ст.? 2. Да якіх дэмаграфічных наступстваў можа прывесці міграцыя з сельскай мясцовасці ў горад?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Падрыхтуйце матэрыял для краязнаўчага кутка па размяшчэнні храмаў на тэрыторыі вашага раёна.

## § 25. Гарадское і сельскае насельніцтва

***Успомніце.*** *Якія тыпы паселішчаў існуюць у свеце? Што такое ўрбанізацыя?*

**1. Гарадское і сельскае насельніцтва.** У Беларусі колькасць гарадскіх жыхароў і іх доля ў агульнай колькасці насельніцтва пастаянна павялічваецца, што адпавядае сусветнай тэндэнцыі ўрбанізацыі. Індустрыялізацыя, навукова-тэхнічны прагрэс, рост адукацыйнага і культурнага ўзроўню

насельніцтва XX ст. актывізавалі міграцыю жыхароў з сельскай мясцовасці ў гарады. Але ў канцы стагоддзя гэты працэс запаволіўся. Тым не менш гарады застаюцца цэнтрамі эканамічнага жыцця, навукі, паслуг, інфармацыі, культуры і г. д. Нягледзячы на дэпапуляцыю, колькасць насельніцтва ў многіх гарадах працягвае павялічвацца.

Знайдзіце на карце атласа (с. 33) гарады, у якіх колькасць насельніцтва павялічваецца.

Як вы думаеце, чаму доля гарадскога насельніцтва павялічваецца, а сельскага — памяншаецца?

Паводле перапісу 2019 г., у Беларусі ў гарадах пражывала 77,3 % насельніцтва, у цяперашні час — 78,4 %. Доля сельскага насельніцтва менш за 22 %. Самая высокая доля гарадскога насельніцтва ў Магілёўскай вобласці — больш за 80 %, а самая нізкая — у Мінскай (без Мінска) — менш за 55 %.

На мяжы XX–XXI стст. доля сельскага насельніцтва ў агульнай колькасці насельніцтва знізілася. Прычыны гэтага — канцэнтрацыя будаўніцтва жылля ў гарадах, адрозненні ўмоў жыцця ў гарадах і сельскай мясцовасці. Адток сельскіх жыхароў у гарады пагоршыў узроставую структуру сельскага насельніцтва: стала менш моладзі, узрасла доля асоб пенсійнага ўзросту. Сёння праводзіцца комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на збліжэнне горада і вёскі, развіццё сацыяльнай сферы, паляпшэнне ўмоў жыцця і добраўпарадкаванне сельскіх паселішчаў.

Населеныя пункты звязаны паміж сабой вытворчымі, гандлёвымі, культурнымі і іншымі адносінамі. Яны адрозніваюцца месцазнаходжаннем, колькасцю жыхароў, гаспадарчымі функцыямі, планіроўкай. Вылучаецца гарадское і сельскае рассяленне. Выкарыстанне тэрыторыі для сельскай гаспадаркі абумовіла фарміраванне сельскіх паселішчаў. Пазней узнікаюць гарады, насельніцтва якіх займалася рамеснай дзейнасцю і гандлем.

**2. Гарадское рассяленне і тыпы гарадоў.** Першыя гарады ўзнікалі на ўзвышаных берагах рэк і азёр, на скрыжаванні транспартных шляхоў. Сярод іх такія старажытныя гарады, як *Полацк*, Заслаўе, Тураў, *Брэст*, *Віцебск*, *Магілёў*, *Мінск*, Орша, *Пінск*, Барысаў, Слуцк.

Успомніце паходжанне назваў старажытных гарадоў Беларусі.

З цягам часу колькасць гарадскіх паселішчаў і колькасць жыхароў у іх няўхільна раслі. У цяперашні час у Беларусі 115 гарадоў і 85 пасёлкаў гарадскога тыпу. У залежнасці ад колькасці насельніцтва і эканамічнага патэнцыялу яны ўплываюць на развіццё іншых паселішчаў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У другой палове XX ст. на месцы будаўніцтва буйных прамысловых прадпрыемстваў з'явіліся новыя, маладыя гарады: Белаазёрск, *Жодзіна*, Новалукомль, *Наваполацк* (мал. 86), Светлагорск і *Салігорск*.

У адпаведнасці з адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам да катэгорыі гарадоў адносяцца: Мінск — сталіца Рэспублікі Беларусь; гарады абласнога падпарадкавання — населеныя пункты з колькасцю насельніцтва не менш за 50 тыс. чал., якія з'яўляюцца адміністрацыйнымі, эканамічнымі і культурнымі цэнтрамі; гарады раённага падпарадкавання — населеныя пункты з колькасцю насельніцтва не менш за 6 тыс. чал., якія маюць арганізацыі прамысловага, сацыяльна-культурнага і бытавога прызначэння. У асобных выпадках пры наяўнасці перспектыў развіцця колькасць насельніцтва можа не дасягаць 6 тыс. чал. Колькасць насельніцтва ў самым маленькім горадзе Дзісне складае крыху больш за 1400 чалавек.

У залежнасці ад колькасці жыхароў гарады ў краіне падзяляюцца на малыя (да 20 тыс. чал.), сярэднія (20–100 тыс. чал.) і вялікія (звыш 100 тыс. чал.). Сярод вялікіх вылучаюць буйныя (100–500 тыс. чал.), найбуйнейшыя (больш за 500 тыс. чал.) і гарады-мільянеры (больш за 1 млн чал.).

У нашай краіне адзіным горадам-мільянерам з'яўляецца сталіца — горад Мінск. Колькасць жыхароў у Мінску складае 1995 тыс. чал. Да катэгорыі найбуйнейшых гарадоў адносіцца *Гомель* (502 тыс. чал.), а астатнія абласныя цэнтры і некаторыя раённыя (*Бабруйск*, *Баранавічы*, *Барысаў*,




Мал. 86. Горад Наваполацк

*Мазыр*, *Ліда*, *Маладзечна* і інш.) — буйныя гарады. Менавіта яны сёння займаюць вядучае месца ў сістэме рассялення і ўплываюць на развіццё іншых тыпаў паселішчаў. Каля 15 % гарадскога насельніцтва пражывае ў сярэдніх гарадах.

На картах атласа (с. 31) знайдзіце буйныя гарады, якія не з'яўляюцца абласнымі цэнтрамі.

Па колькасці пераважаюць малыя гарады (65 % гарадскіх паселішчаў) — цэнтры адміністрацыйных раёнаў. Іх развіццё звязана з наяўнасцю прамысловых прадпрыемстваў, пераважна харчовай прамысловасці.

Гарады на тэрыторыі Беларусі размешчаны ў асноўным раўнамерна.

Многія гарады размяшчаюцца ўздоўж транспартных калідораў, на берагах рэк і азёр, паблізу радовішчаў карысных выкапняў. Чым тлумачыцца такое размяшчэнне?

Напрыканцы XX ст. асаблівае месца ў рассяленні занялі гарады-спадарожнікі. Гэта горад ці пасёлак гарадскога тыпу, які знаходзіцца і развіваецца не далей за 60 км ад буйнога горада або буйнога прадпрыемства і складае з ім адзіную эканамічную і дэмаграфічную сістэму.

Гарады-спадарожнікі Мінска: Лагойск, Дзяржынск, Фаніпаль, Заслаўе, Смалявічы і Рудзенск; Брэста — Жабінка; *Гродна* — Скідзель. Канцэнтрацыя гарадоў-спадарожнікаў вакол пэўнага цэнтра прыводзіць да ўтварэння агламерацыі, напрыклад *Мінскай*.

Да гарадскіх паселішчаў у Беларусі, акрамя гарадоў, адносяцца пасёлкі гарадскога тыпу, сярод якіх вылучаюцца гарадскія, рабочыя і курортныя пасёлкі. Яны адрозніваюцца меншай колькасцю насельніцтва і меншай колькасцю гаспадарчых функцый. Рабочыя пасёлкі размешчаны пры прамысловых арганізацыях, электрастанцыях, чыгуначных станцыях. У Беларусі пяць рабочых пасёлкаў: Рэчыца ў Столінскім раёне, Ялізава і Татарка — у Асіповіцкім, Сасновы Бор — у Светлагорскім і Бальшавік — у Гомельскім. У Мядзельскім раёне размешчаны курортны пасёлак Нарач. Некаторыя пасёлкі гарадскога тыпу могуць мяняць статус. Пасля 2010 г. пасёлкі гарадскога тыпу Астравец, Круглае і Бялынічы атрымалі статус гарадоў.

Чаму п. г. т. Астравец атрымаў статус горада?

**3. Сельскае рассяленне.** Размяшчэнне сельскіх населеных пунктаў, як правіла, залежыць ад прыродных умоў. Іх колькасць большая ў месцах са спрыяльнымі ўмовамі для сельскагаспадарчага асваення тэрыторыі.

Па даных на 1 студзеня 2024 г., сельскае насельніцтва краіны пражывае ў 23 тыс. населеных пунктаў. У сярэднім на адзін сельскі населены



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

пункт прыпадае 86 жыхароў, а адлегласць паміж пунктамі складае каля 3 км.

Чым адрозніваюцца гэтыя сельскія паселішчы?

Да катэгорыі сельскіх населеных пунктаў адносяцца: аграгарадкі, пасёлкі, вёскі, хутары. Колькасць малых вёсак скарачаецца, яны аб'ядноўваюцца ў больш буйныя.

З 2005 г. некаторыя вёскі і пасёлкі ў краіне сталі пераўтварацца ў аграгарадкі (мал. 87).

**Аграгарадок** — добраўпарадкаваны сельскі населены пункт з вытворчай і сацыяльнай інфраструктурай, якая забяспечвае сацыяльныя стандарты насельніцтву, якое пражывае ў ім і на прылеглых тэрыторыях.

Паняцце «аграгарадок» з'явілася ў Беларусі ў сувязі з прыняццем Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі на 2005–2010 гг. У цяперашні час у краіне каля 1500 аграгарадкоў.

Сельскае рассяленне характарызуецца двума паказчыкамі: 1) люднасцю, або велічынёй населеных пунктаў па колькасці жыхароў, і 2) гушчынёй сельскіх паселішчаў у разліку на 100 км . Першы з іх на тэрыторыі Беларусі ў напрамку з поўначы на поўдзень узрастае, а другі, наадварот, памяншаецца.



Мал. 87. Аграгарадок Тамашоўка ў Брэсцкім раёне

Колькасць і люднасць сельскіх населеных пунктаў мае значныя тэрытарыяльныя адрозненні. У Віцебскай вобласці колькасць сельскіх населеных пунктаў (6178) амаль у 3 разы перавышае іх колькасць у Брэсцкай вобласці (2152). Аднак колькасць сельскіх жыхароў у Брэсцкай вобласці больш як у 1,5 разу большая, чым у Віцебскай вобласці. Растлумачце прычыны такіх адрозненняў.

**Падвядзём вынікі.** У Беларусі ў гарадах пражывае больш за 78 % жыхароў. У краіне 115 гарадоў і 85 пасёлкаў гарадскога тыпу. Горадам-мільянерам з'яўляецца Мінск. Сельскае насельніцтва пражывае ў 23 тыс. населеных пунктаў. З 2005 г. некаторыя вёскі і пасёлкі сталі пераўтварацца ў аграгарадкі.

***Праверце сябе.*** 1. Чаму колькасць гарадскога насельніцтва большая, чым сельскага? 2. Назавіце старажытныя і маладыя гарады Беларусі. 3. На якія тыпы падзяляюцца а) гарады; б) пасёлкі гарадскога тыпу; в) сельскія населеныя пункты? 4. Што такое аграгарадок?

***Праблемныя пытанні.*** 1. У чым сутнасць змен у рассяленні, якія адбываюцца ў Беларусі ў сучасны перыяд? 2. Якая роля ў развіцці краіны адводзіцца Мінскай агламерацыі?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Распрацуйце рэкламны буклет «Населены пункт, у якім я жыву».



Правообладатель Адукацыя і выхаванне